**Чарняўская, В.** Няхай вечнай будзе памяць / В. Чарняўская // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2019. — 20 лют. — С. 2, 4.

# НЯХАЙ ВЕЧНАЙ БУДЗЕ ПАМЯЦЬ

За 10 няпоўных год афганскай вайны загінула і памерла ад ран амаль 15 тысяч салдат, з іх каля 800 – беларусаў. У ліку тых хлопцаў, якія аддалі жыццё на той чужой далёкай зямлі, 19-гадовы **Леанід Сандзюк** з вёскі Стуканы Глыбоцкага раёна.

Памяць пра яго беражліва захоўваецца не толькі ў Глыбоцкім, але і ў нашым Шаркаўшчынскім раёне. Ужо шмат гадоў у вёсцы Васюкі разам з дачкой Таццянай пражывае бацька загінуўшага воіна-афганца Веніямін Паўлавіч Сандзюк. І ўжо стала традыцыяй кожны год, напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, наведваць гэту сям'ю, якой афганская вайна зімой 1982 года прынесла так многа гора. 14 лютага дэлегацыя ў складзе начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Людмілы Уладзіміраўны Стомы і старшыні раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Васілія Савіча Протаса прыехала ў дом да Веніяміна Паўлавіча Сандзюка, уручыла яму юбілейны медаль «30 год вываду савецкіх войскаў з Афганістана» і грашовую дапамогу ад Шаркаўшчынскага раённага выканаўчага камітэта.

– Сын Лёня спачатку служыў у Мар'інай Горцы, – расказаў Веніямін Паўлавіч, – затым трапіў у Туркменістан, а летам 1981 года ўжо быў у Афганістане. У снежні ён даслаў нам ліст. Пісаў «стаім высока ў гарах, ахоўваем аб'ект. Відаць, тут і прыйдзецца сустракаць Новы год. Толькі без снегу і ёлкі». Пасля таксама прыходзілі лісты ад сына, у якіх ён адзначаў, што першы год воінскай службы запомніцца на ўсё жыццё. Хоць дакладнай інфармацыі ў нас не было, мы, бацькі, безумоўна, адчувалі, як няпроста сыну на чужыне.

Ужо ў пачатку лютага 1982 года ваеннаслужачы Леанід Сандзюк быў цяжка паранены падчас артылерыйскага абстрэлу пры тушэнні складоў з боепрыпасамі. Калі загарэлася суседняя палатка, ён кінуўся ратаваць салдат, якія там знаходзіліся, і зусім побач узарваўся артылерыйскі снарад... Цяжка параненага хлопца даставілі ў шпіталь, але медыкі нічога ўжо не змаглі зрабіць. 12 лютага Леаніда не стала. За праяўленыя мужнасць і гераізм ордэнам Чырвонай Зоркі Леанід Веніямінавіч Сандзюк ўзнагароджаны пасмяротна.

У бацькі салдата, Веніяміна Паўлавіча Сандзюка, які ў гэтым годзе адзначыць свой 89-ы год нараджэння, ёсць яшчэ дзеці, унукі і праўнукі. Але і сёння за Лёню па-ранейшаму баліць сэрца, хоць з той чорнай даты прайшло ўжо 37 год. Такія раны не гоіць час. З удзячнасцю за тое, што памяць пра яго сына жыве, Веніямін Паўлавіч прыняў ад дэлегацыі гасцей юбілейны медаль, грашовую дапамогу і кветкі. Напярэдадні Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў ён пажадаў будучым пакаленням заўсёды берагчы мір на зямлі, каб усе бацькі маглі дачакацца сваіх дзяцей жывымі і здаровымі.

**Вольга ЧАРНЯЎСКАЯ**